ISSN 0321-1649 (print)
УДК 398.332.47(=161.3)

Пастуціў у рэдакцыю 18.10.2016
Received 06.09.2016

**А. І. Ляшкевіч**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ТЭМЫ ПРОВАДАЎ ЗІМЫ І СУСТРЭЧЫ ВЯСНЫ Ў МАСЛЕНІЧНЫХ АБРАДАХ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ

Мотивы проводов зимы и кликанья весны в масленичных обрядах белорусского Полесья проанализированы с использованием этнолингвистической методологии. Масленица рассматривается как один из праздников весеннего новолетия, ритуал перехода (в терминологии Арнольда ван Геннепа). В качестве ступеней перехода выделяются проводы зимы и кликанье весны. Использованы также наработки А. К. Байбурина, который уточняет выделенные ван Геннепом этапы в ритуале: «старый мир», который существовал до проведения ритуала, десемиотизируется; затем происходит создание новой семиосферы, собирание «нового мира» из обособленных частей; в конце ритуала – освоение созданного заново мира, его ритуальный раздел. Символический «старый мир», старый сезон в масленичных обрядах – это зима, а новый – весна.

Проводы зимы и кликанье весны в полесской масленичной обрядности рассматриваются во взаимосвязи. Анализируются такие аспекты проводов зимы на Полесье, как сжигание чучела, ветоши, демонстрация специально сделанной куклы-чучела. Акцентируется внимание на таких особенностях масленичного кликанья весны, как исполнение весенних песен возле костра, в котором жгут чучело или ветошь, локально (Житковичский и Столинский р-ны) – кликанье весны с сыром в руках.

*Ключевые слова:* Масленица, проводы зимы, кликанье весны, Полесье, ритуал перехода, весеннее новолетие.

**Ye. I. Leshkevich**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## MOTIVES OF BIDDING FAREWELL TO WINTER AND GREETING SPRING IN SHROVETIDE RITES IN BELARUSIAN POLESIE REGION

The motives of bidding farewell to winter and calling for spring in Shrovetide rites in Belarusian Polesie are analyzed using ethnolinguistic methods. Shrovetide is considered as a springtime new year holiday – a rite of passage (as defined by Arnold van Gennep). The bidding farewell to winter and calling for spring are distinguished as phases of passage. The article also uses research results by Albert Baiburin who updates van Gennep's rite phases: the “old world” that existed before the rite is desemiotized; then a new semiosphere is created – a “new world” is gathered together of detached parts; the world created anew is explored and is ritually divided in the end of the rite. The symbolic “old world,” i.e. the old season, in Shrovetide rites is winter, with spring being a new one.

Bidding farewell to winter and calling for spring Shrovetide rites in Polesie region are considered in their interrelationship. Such aspects of bidding farewell to winter in Polesie as burning a dummy and rags and demonstrating a specially made doll are analyzed. A focus is made on such specific features of calling for spring during Shrovetide as singing spring songs by the bonfire of the dummy or rags, and (locally, in Žytkavičy and Stolin Districts) calling for spring with a piece of cheese in one's hands.

*Keywords:* Shrovetide, bidding farewell to winter, calling for spring, Polesie, the rite of passage, springtime new year.

Масленіца ўваходзіць у шэраг абрадавых комплексаў, якія пазначалі старажытнае вясновае навалецце. Асобныя элементы абраднасці, якія ў адной мясцовасці прымеркаваны да Масленіцы, у другой могуць суадносіцца з іншым святам ці перыядам: пачатак спявання і выкананне пэўнага віду вясновых песень, ваджэнне карагодаў, провады зімы, рытуал прасіць даравання ў родных. Гэта сведчыць пра “расцягванне” вясновага навалецця. Як піша Т. А. Агапкіна, “практычна ўсе ранневясновыя даты (як фіксаваныя, так і пераходныя) літаральна насычаны ініцыяльнай сімволікай, што маркіруе канец старога і пачатак новага каляндарнага перыяду і звязана з ідэямі абнаўлення, пачатку, маладосці…” [1, с. 152].

Масленіца як адно са свят навалецця належыць да рытуалаў пераходу (у тэрміналогіі Арнольда ван Генэпа), для якіх характэрна паслядоўная змена прэлімінальнай, лімінальнай і постлімінальнай фаз. Такая трохчасткавая структура рытуалу мае ўнутраную сувязь, што фарміруецца ў сюжэт пераходу. Ван Генэп падкрэсліваў, што ў кожным асобна ўзятым рытуале гэтыя тры этапы могуць

© Ляшкевіч А. І., 2017

быць няроўныя па значнасці і ступені распрацоўкі. Ван Генэп адносіў да рытуалаў пераходу абрадавыя комплексы, звязаныя з жыццёвым цыклам чалавека, а таксама рытуалы, звязаныя са зменай касмічных з'яў: фаз Месяца, пор года [2]. Згодна з высновамі А. К. Байбурына, любы каляндарны рытуал з'яўляецца рытуалам пераходу і праводзіцца для таго, "каб адзін перыяд (сезон) змяніўся іншым". Даследчык удакладняе выдзеленыя ван Генэпам этапы ў рытуале: дэсеміятызацыя свету, сітуацыя распаду, нераздзельнасці (прадстаўнікі іншасвету аказваюцца сярод людзей, а праявы жыццядзейнасці апошніх зводзяцца да мінімуму); стварэнне новай семіясферы, збіранне "новага свету" з адасобленых частак; засваенне створанага наноў свету, яго рытуальны падзел, размеркаванне долі між удзельнікамі рытуалу, у т. л. прадстаўнікамі іншасвету [3, с. 149–150]. Сімвалічны "стары свет", стары сезон у масленічных абрадах – гэта зіма, а новы – вясна.

***Провады зімы.*** Для завяршэння каляндарных перыядаў характэрна сімволіка выправоджвання, з якой І. А. Марозаў і І. С. Сляпцова звязваюць паленне вогнішчаў на Масленіцу [4, с. 295]. У якасці ўвасаблення зімы падчас беларускіх масленічных абрадаў часам згарае антрапаморфнае пудзіла, найчасцей у жаночай іпастасі. Антрапаморфнае пудзіла як каляндарны сімвал[2] Масленіцы сустракаецца ў рускіх, у Харватыі, Славеніі, Польшчы, Славакіі, Чэхіі [1, с. 583–592]. В. К. Сакалова вылучае ў рускіх два асноўныя тыпы провадаў Масленіцы: вогнішчы і праводзіны-пахаванні абрадавага пудзіла. Даследчыца прыходзіць да высновы, што звычай паліць вогнішчы на Масленіцу быў агульнарускі, распаўсюджаны ў т. л. у Пскоўскай і Смаленскай губернях. Праводзіны-пахаванні масленічнага пудзіла характэрны для Рускай Поўначы [5, с. 17–18]. Заўважым, што ў склад Пскоўскай і Смаленскай губерняў уваходзілі і беларускія этнічныя тэрыторыі (па картах рассялення беларусаў М. В. Доўнар-Запольскага і Е. Ф. Карскага) [6, с. 76]. Т. А. Агапкіна піша, што спальванне пераважала як форма пазбаўлення ад масленічнага сімвала ў рускіх, што звязвае з сумяшчэннем у рускай Масленіцы традыцый вырабу каляндарнага сімвала і распальвання вогнішчаў [1, с. 586].

Спальванне пудзіла выступае кульмінацыяй амаль любога сучаснага святкавання Масленіцы ў Беларусі, гарадскога і сельскага. Між тым, зусім няшмат этнаграфічных крыніц сведчаць аб даўнейшым бытаванні звычаю спальвання масленічнага пудзіла на тэрыторыі Беларусі (мал. 1).

Адзін з арэалаў спальвання масленічнага пудзіла складае ўсходняе Палессе. Звесткі сустракаюцца ў вёсках Нісімкавічы Чачэрскага р-на [7, с. 567], Буркі Брагінскага р-на [8, с. 161], Залессе Добрушскага р-на [9, с. 219], Настолле (цяп. г. Хойнікі) Хойніцкага р-на [10, с. 78], Свіднае Лельчыцкага р-на[3]. У цэнтральнабеларускім рэгіёне згадкі спальвання пудзіла сустракаюцца ў Любанскім [11, с. 121–122; 12, с. 149] і Бярэзінскім[4] р-нах. Варта адзначыць, што Любанскі р-н па асаблівасцях традыцыйнай культуры знаходзіцца на мяжы гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Усходняга Палесся. З. Я. Мажэйка адзначала: "Палескі спеўны стыль ахоплівае цэнтральныя раёны Беларусі (прыкладна да лініі Клецк – Бабруйск)" [13, с. 5]. Бярэзінскі ж р-н уключаюць у т. зв. "Малое Палессе" – рэгіён паміж рэкамі Бярэзіна і Друць[5].

Сустракаюцца звесткі пра выраб пудзіла без яго спальвання. У в. Будча Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. на Масленіцу абыходзілі двары з лялькай: «*Носім ужо тую Немку... перад постам, ці ў нядзелю, ці ў суботу... Падругі мы, дзяўкі, дзяўчата, прыбяром, бы кукалка... на качалацы... бы сукеначчка якая, да бы касьнічкі, бы дзевачка яна была. Ліцо беленьке рабілі, галоўку прыстройвалі, нешта рысавалі, бы вочы, ды й носік, бы дзіцятко якое. А тут ужо сукеначка ды хустачка. Ці валена <вэлюм> рабілі. А тут каўнерчыка харошага, кругленькага з каруначкамі кругом ужэ. Кажны гурт насіў сваю <Немку>. Хадзілі па хатах, дый давалі нам ужо хто што дась. Казалі:*

[2] Згодна з Т. А. Агапкінай, каляндарныя сімвалы – гэта антрапа-, арніта-, ці фітаморфныя «рэчавыя» сімвалы, якія адлюстроўваюць міфапаэтычную семантыку каляндарнага часу [1, с. 578–579].

[3] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. у пас. Крупскі Крупскага р-на Мінскай вобл. ад Касінскай (дзяв. Бжэзіцка) Антаніны Адамаўны, 1941 г. н., нар. у в. Свіднае Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

[4] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2015 г. у в. Чыжаха Бярэзінскага р-на ад культработніцы Карканіцы (дзяв. Пікарэвіч) Кацярыны Уладзіміраўны, 1957 г. н., нар. у в. Прыцерпа Бярэзінскага р-на, у Чыжасе жыве з 1984 г.

[5] У склад Малога Палесся ўваходзяць лясістыя часткі Барысаўскага, Лепельскага, Чашніцкага, Талачынскага, Круглянскага, Бялыніцкага і Крупскага р-наў, па прыродных асаблівасцях рэгіён нагадвае Вялікае Палессе [14].




Мал. 1. Спальванне масленічнага пудзіла на тэрыторыі Беларусі

Fig. 1 . Burning Shrovetide Dummy in Belarus

*“Немку носім, сала просім, на Запускі – па два кускі,па тры кускі”»*[1]. Па іншых звестках, з Немкай хадзілі толькі да бабылёў з мэтай падабраць ім нявесту [16, с. 34–35]. Звяртае на сябе ўвагу “немата”, што прыпісваецца лялльцы ў Будчы і адлюстроўваецца ў яе імені: *“<Чаму яна Немкай звалася?> Мо не гаварыла. Нейка дзеўка”*[2]. У в. Тонеж Лельчыцкага р-на на Масленіцу цяпер робяць пудзіла ў жаночай іпастасі[*]. Перад тым, як спаліць, замазваюць пудзілу галавешкай твар, прыгаворваючы: *“Ну шо, замазуем ей вочы, хай на нас не глядзіць, хай ужо весна к нам ідзе!”*[3] Калі ўвасабленне зімы невідушчае, сімвалічна паслабляецца яго ўплыў, вызваляецца дарога вясне, кажуць: *“Усё, горыць зіма!”*[4]. Слепата пудзіла з Тонежа і немата Немкі з Будчы сімвалічна набліжаюць масленічную ляльку да тагасвету, раскрываюць яе медыятыўны характар. Да таго ж імя Немкі магло пазначаць яе статус “чужой” для вясковага соцыуму.

Дэманстраванне масленічнага пудзіла без згадкі яго спальвання сустракаецца ў в. Ленькі Слуцкага р-на, на мяжы з Палессем: *“На Масьленку каня запрагуць і ўсягда каталіся. А то пасадзяць жанок – да мужчыны возьмуць санкі і жанчын возяць па сяле. А то чучала змайструюць: які андарак возьмуць на палачку, да хусту закруцяць – і вязуць”*[5] [11, с. 118]. Невядома, што рабілі з масленічнымі лялькамі ў Будчы і Леньках пасля свята. Магчыма, іх чакала “нату-

[1] Зап. М. Лук’янава, А. Варахоб і Н. Гвоздзева ў 2015 г. у в. Будча Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ад Савені Надзеі Матвееўны, 1932 г. н., правасл., мясц. [15].

[2] Зап. М. Лук’янава, А. Варахоб і Н. Гвоздзева ў 2015 г. у в. Будча Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ад Савені Надзеі Матвееўны, 1932 г. н., правасл., мясц. [15].

[*] Недастаткова звестак, каб з упэўненасцю сцвярджаць існаванне звычаю ў мінулым.

[3] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2014 г. у в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад Карась Марыі Іванаўны, 1958 г. н.

[4] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2014 г. у в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад Карась Марыі Іванаўны, 1958 г. н.

[5] Зап. у в. Ленькі Слуцкага р-на Мінскай вобл. ад Марыі Дробыш, 1920 г. н.

ральная смерць", якую Т. А. Агапкіна прыводзіць як адзін з варыянтаў завяршэння жыццёвага цыкла каляндарнага сімвала нароўні з яго знішчэннем шляхам спалення, закопвання, патаплення, выкідання і г. д. [1, с. 578].

У в. Закальное Любанскага р-на: *«От хто зробіць дома пудзіло, ці на палкі абвітыя саломаю жаночу адзежу надзявалі, ці от просто на сухую галіну, дажэ хустку завяжуць. І з тым пудзілам хадзілі па ўсему селу. Людзі выходзілі і павязвалі такіе істужачкі із крамы, казалі "грахі павязваць". Занясуць тое пудзіло за сяло і спаляць»*[10] [11, с. 121]. Павязваннем стужачак на пудзіла вяскоўцы фактычна ўдзельнічалі ў яго стварэнні. На тое, што пудзіла робіцца ўскладчыну, звяртае ўвагу даследчык А. К. Байбурын. Такое "збіранне" каляндарнага сімвала ён звязвае з "сімволікай збірання свету, які распаўся" ў перыяд, які папярэднічае здзяйсненню рытуалу [3, с. 133, 139].

Масленічных лялек, прызначаных як для спальвання, так і для закопвання, часта выраблялі з саломы [8, с. 161; 17, с. 66; 11, с. 121[11]; 18[12]], якая ў народна-міфалагічных уяўленнях беларусаў судачыняецца з ураджаем і ў той жа час са светам продкаў [19, с. 448]. Салома, старое адзенне, што выкарыстоўвалі для вырабу масленічных лялек, выразна паказваюць, з аднаго боку, на "нямогласць" старога сезона, што саступае правы, адыходзіць, памірае. З другога боку, старасць і смерць змяшчаюць інтэнцыю да адраджэння ў новай форме: попел пасля спальвання пудзіла рассыпаюць па палях, што павінна спрыяць добраму ўраджаю [7, с. 567; 10].

Замест пудзіла на Масленіцу маглі паліць старыя рэчы, кастрыцу, салому [11, с. 121] – дзеянне мае тую ж семантыку, што і спальванне пудзіла. Палячы старызну на Масленіцу, у в. Опаль Іванаўскага р-на прыгаворвалі: *"Ідэ зіма до тучы, берэ постолы і ганучы"* [20, с. 160]. У в. Моталь таго ж раёна з падобнымі прыгаворкамі выганялі зіму на Масленіцу, стукаючы кіямі: *«Ходылы хлопцы с кіямі, стукалы, крычалы: "Ходы, зіма, до Кучова, бо ты нам надокучала". Шлы, кіямі трахалы і трахалы. Кучова – это сіло дальшэ. В каждой вулыцы свої хлопцы, зборня была»*[13] [21, с. 98]. Такое выгнанне зімы знайшло адлюстраванне ў "гукальных" песнях: *"Ой, Маслянка-несчаслянка, сера вутка. У!/Ты ж казала, вясна скора, да й няхутка. У!/ Праводзім зіму з качаргамы, У!/Сустрэнім вясну з пірагамы, У!"*[14] [22, с. 59, 131, 150].

На паўночным усходзе Брэстчыны провады зімы з падобнымі прыгаворкамі адбываліся на Фаміным тыдні [21, с. 124–126]: *«Радуніца ва вторнік после Праводной недзелі, а в нас обязацельна в понедзельнік вечерам ужэ маці готуе вэчэру шо найсмачнейшу... повечэралі, пойілы і вжэ господыня, і дыты, всі, бяруць хто дыркача, хто лопату, хто эту гачку, хто вылкы і вжэ із-под коёк, із-под лавок выгоняюць: "Іды, Зыма, од нас, іды до Кучава, бо ты нас всіх помучыла!", "Іды, Зіма, до Кракова, чэрэз год прыйдэш до нас однаково!" І ту Зіму выганяюць і жэнут ее, ну, як есьць такое небольшое азерцэ ці якая рэчанька блізко, то туды. І вжэ гэто шо дзержаць, ну, обычно палкі берут ужэ, тыя постаўляць коло хаты, а палку беруць ідуць, і вжэ гэтыя палкі кідаюць всі в воду...»*[15]. Звычай провадаў (выгнання) зімы на Фаміным тыдні складае рэгіянальную спецыфіку Брэстчыны [21, с. 124]. У прыведзеным апісанні выгнання зімы на Фаміным тыдні бачым дзеянні, характэрныя для святкавання Масленіцы на Палессі (спальванне пудзіла і старых рэчаў), але замацаваныя за іншым абрадавым часам.

У вёсцы Перарова Млынок Жыткавіцкага р-на зафіксаваны перанос на Праводную нядзелю Масленічнага звычаю прасіць адно ў аднаго даравання [8, с. 210–211]. Звесткі пра такі ж перанос, толькі на Вялікдзень, запісаны і ў вёсцы Неглюбка Веткаўскага р-на [8, с. 211]. У Добрушскім р-не зафіксавана ўяўленне, што на Масленіцу *"зіма з летам устракающа"*[16] [9, с. 220], хаця звычайна так кажуць пра Стрэчанне. Усё гэта сведчыць пра "расцягванне" вясновага навалецця і магчымасць прымеркавання такога яго элемента, як провады зімы, да розных свят.

[10] Зап. С. Г. Выскварка ў 2000 г. у в. Обчын Любанскага р-на Мінскай вобл. ад Галай Зоні Нічыпараўны, 1932 г. н.

[11] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. у пас. Крупскі Крупскага р-на Мінскай вобл. ад Касінскай (дзяв. Бжэзіцка) Антаніны Адамаўны, 1941 г. н., нар. у в. Сярэднія Печы Лельчыцкага р-на, з 1949 г. у в. Свіднае Лельчыцкага р-на, у Крупскім з 2004 г.

[12] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2015 г. у в. Чыжаха Бярэзінскага р-на ад культработніцы Карканіцы (дзяв. Пікарэвіч) Кацярыны Уладзіміраўны, 1957 г. н., нар. у в. Прыцерпа Бярэзінскага р-на, у Чыжасе жыве з 1984 г.

[13] Зап. у в. Моталь Іванаўскага р-на ад Анастасіі Мінько, 1935 г.н.

[14] Зап. у в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на ад Е. В. Глушаковай, А. К. Ермаковай, В. І. Фяськовай, П. М. Мельнікавай, Г. Е. Судненкі.

[15] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2015 г. у в. Перасудавічы Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. ад Мікуліч Надзеі Васільеўны, 1942 г. н., правасл., нар. у в. Здзітава Бярозаўскага р-на.

[16] Зап. студэнтка Гомельскага педуніверсітэта А. Стальмахова ў 2000 г. у в. Кругавец Добрушскага р-на ад Кабанчук Святланы Мікалаеўны, 1938 г. н. (перасяленка з в. Астрагляды Брагінскага р-на).

Такім чынам, выгнанне зімы на Палессі магло прымяркоўвацца да перыяду ад Стрэчання да Фаміна тыдня і ўвасабляцца выдаленнем (выкіданнем, спальваннем) за межы "сваёй" прасторы ўвасаблення "старога" сезона: пудзіла, старызны. Тэндэнцыю старых рэчаў, што спальваліся на Масленіцу, набываць рытуальны сэнс і станавіцца сімвалам свята адзначае А. К. Байбурын [3, с. 138–144]. Ён звяртае ўвагу на старое адзенне масленічнага пудзіла, мяркуючы, што яно сімвалізуе старасць, зношанасць свету, які аднаўляецца ў масленічным рытуале [3, с. 132–133]. На Рускай Поўначы ў апошні дзень Масленіцы ці ў першы панядзелак Вялікага посту маглі спаліць пудзіла, старыя рэчы ці проста раскласці вогнішча, што звалася "жегчи масленицу". І. А. Марозаў і І. С. Сляпцова робяць выснову, што "адна з мэт масленічнага вогнішча – пазбаўленне ад старога хламу, што адслужыў сваё і стаў шкодным", зазначаюць таксама, што "перыяд канца Масленіцы і пачатку Вялікага посту… ва ўсіх народаў Еўропы, у т. л. у рускіх, быў звязаны з абрадамі і звычаямі ачышчэння" [4, с. 294, 809, 818].

***Гуканне вясны.*** Пачатак спявання вяснянак вызначаецца ў розных рэгіёнах Беларусі пэўнымі святамі (найчасцей Грамніцы, Масленіца, Саракі, Благавешчанне, сустракаецца – ад Аўдакеі, Аляксея, прысвяткаў, істотных у лакальнай традыцыі, а таксама з сярэдзіны Вялікага посту, Вялікадня, Ушэсця) ці прыроднымі з'явамі ("снег растаў", "як пойдзе лёд", "як трава на лугах зацвіце, лотаць на водзе", "як жаваранак прылятае") [23, с. 53; 17, с. 83, 87; 24, с. 94, 100; 21, с. 67, 103; 11, с. 122, 124; 8, с. 106–110]. Масленічнае гуканне вясны і спяванне вяснянак найбольш характэрнае для Палесся і памежных з ім раёнаў (мал. 2).

Гэта вёскі Дуброўнае і Новы пуць Брагінскага р-на [8, с. 161], Вялікі бор Хойніцкага р-на [10, с. 78], Губічы Буда-Кашалёўскага р-на[17] , Тонеж[18] , Букча і Дзяржынск [25, с. 112–114] Лельчыцкага р-на, Пагост, Новыя Мілевічы, Дзякавічы [8, с. 161–162], Буразь[19] , Азяраны [26, с. 10] і Хваенск [26, с. 40] Жыткавіцкага р-на, Багданаўка [21, с. 98] і Дзятлавічы[20] Лунінецкага р-на, Аснежыцы Пінскага р-на [21, с. 98], Дзяменічы Жабінкаўскага р-на [21] , Кустыні Астрамечава Брэсцкага р-на [27, с. 36], Обчын і Закальное Любанскага р-на [11, с. 121–122], Сякерычы Клецкага р-на[22] [28]. Гэта тлумачыцца кліматычнымі асаблівасцямі рэгіёна: тут цяплее раней, чым на астатняй тэрыторыі Беларусі.

Другі арэал спявання вяснянак на Масленіцу вылучаецца на Малым Палессі і ў Цэнтральнай Беларусі: вёскі Клінок Чэрвенскага р-на[23] [29], Раўкуцевічы Мінскага р-на[24], Ляшчыны Барысаўскага р-на[25], Стараселле Крупскага р-на [11, с. 122].

Гуканне вясны ў масленічных абрадах шчыльна звязана з провадамі зімы, што адрозніваe яго ад гуканняў, прымеркаваных да іншых свят. Вяснянкі на Масленіцу часта выконваюцца пры вогнішчы, у якім паляць пудзіла ці старызну. Па звестках А. М. Доўнар-Запольскай, вясну гукалі ля масленічных вогнішчаў у Столінскім, Петрыкаўскім і Добрушскім р-нах. Звесткі, зафіксаваныя ў Добрушскім р-не, пацвярджаюць думку аб шчыльнай звязанасці гукання вясны з провадамі зімы на Масленіцу: «*Казалі, што нада тут жа сразу, як згарыць, і Вясну клікаці, каб Зіма зноў не вярнулася*». А. М. Доўнар-Запольская тлумачыць гэта «бояззю стварэння ў часе "пустых месцаў", магчымасці вяртання старога са знакам адмоўнасці часу» [30, с. 210]. Некалькі прыкладаў паказваюць на непадзельнасць завяршэння старога і сустрэчы новага перыяду ў свядомасці інфармантаў. У расповядзе з Жабінкаўскага р-на вясновая песня прыводзіцца ў структуры провадаў Масленіцы: *"На Масленіцу хто шо мае*

[17] Зап. Т. І. Кухаронак у в. Губічы Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. ад Пахомавай Ніны Назараўны, 1931 г. н., мясц., 3 кл., прав.

[18] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2014 г. у в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад групы жанчын.

[19] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. на фестывалі "Покліч Палесся" ў в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г. н., нар. і жыве ў в. Буразь Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

[20] Зап. А. І. Ляшкевіч у 2016 г. на фестывалі "Покліч Палесся" ў в. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. ад Алены Дзянісаўны Яскевіч, 1960 г. н. і Галіны Кузьмінічны Хартановіч, 1957 г. н., нар. і жывуць у в. Дзятлавічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.

[21] Зап. Т. В. Валодзіна ў 2004 г. у в. Дзяменічы Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. ад Саванеўскай Веры Навумаўны, 1934 г. н.

[22] Зап. у в. Сякерычы Клецкага р-на ад Астахавай Вольгі Пятроўны, 1926 г. н.

[23] Зап. Т. І. Кухаронак у в. Клінок Чэрвенскага р-на ад Казачок Вольгі Аляксандраўны, 1932 г. н., мясц., 5 кл.

[24] Зап. Г. А. Арол у 2000 г. у в. Раўкуцевічы Мінскага р-на Мінскай вобл. ад Г. І. Міранковай 1913 г. н.

[25] Зап. Н. Дзямідка ў в. Ляшчыны Барысаўскага р-на Мінскай вобл. ад М. Д. Казак 1925 г. н.




Мал. 2. Гуканне вясны і спяванне вяснянак на Масленіцу ў Беларусі

Fig. 2. Calling for Spring and Singing Spring Songs on Shrovetide in Belarus

*несэ, справлялы, хлопцы горілкі, мы закуску. Делаемо проводы Масленіцы, музыка, спева: Весна красна з выраю выйшла, / Тэпло літэчко нам прынэсла / Малым дэткам побіганнечко, / Старым бабкам посідыннічко”*[26]. У в. Закальное Любанскага р-на: *“Пудзіло пакуль гарыць – то масьленку паюць, а як упадзе – пачынаюць пець веснавыя песні. Это першы раз паюць вясну”*[27] [11, с. 122]. У наступных расповядах провады (“замыканне”) зімы і сустрэча (“запусканне”) вясны выступаюць як адно і тое ж дзеянне: *«Масленая нядзеля пачыналася з панядзелка... Калі садзіліся раніцай ў панядзелак за стол, то бацька гаварыў: “Благаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну запускаці”. А дзеці за старым гукалі: “Гу-у”* [28]*»* [28]; *“Вясну пачыналі сьпяваць на Масьленку. Коні запрагуць, пасядуць у павозку ўзрослыя, едуць па сёлах і пяюць: вясну ўстрэчаюць, а зіму праважаюць”* [29] [11, с. 122].

Непадзельнасць провадаў і сустрэчы адлюстроўваецца і ў песнях: *“Сонэйко, выйды / Зыму зомыкаты... / Вэсну зоклікаты / Зымою – ў вазочку, / Вэсною – ў чаўночку, А ў цёплым леце – / У золотой карэце”* [30] [27, с. 36]. *“Благаславі, Божа, зіму замыкаці... / вясну заклікаці / Зімою ў вазочку, вясною ў чаўночку, / А ў цёплым леце – як у карэце...”*[31] [10, с. 78]. Загукальная песня з такім жа сюжэтам выконвалася ў в. Новае Палессе Лельчыцкага р-на на Стрэчанне [8, с. 109], а ў в. Белы Камень Касцюковіцкага р-на – на Благавешчанне [23, с. 57].

[26] Зап. Т. В. Валодзіна ў 2004 г. у в. Дзяменічы Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. ад Саванеўскай Веры Навумаўны, 1934 г. н.

[117] Зап. С. Г. Выскварка ў в. Закальное Любанскага р-на Мінскай вобл. ад Марыі Ткачук, 1936 г. н.

[28] Зап. у в. Сякерычы Клецкага р-на ад Астахавай Вольгі Пятроўны, 1926 г. н.

[29] Зап. у в. Стараселле Крупскага р-на ад Аляксандрыны Шакуры, 1914 г.н.

[30] Зап. у в. Кустын Брэсцкага р-на ад Янчук Ганны Фёдараўны, 1931 г. н. бел., пісьм., правасл., мясц.

[31] Зап. у 1999 г. студэнтка Н. Тальчук у в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. ад Харошкі Праскоўкі Данілаўны, 1915 г. н.

У вёсках Пагост Жыткавіцкага р-на і Вялікае Малешава Столінскага р-на сустракаюцца звесткі, што на Масленіцу гукалі вясну з сырам у руках [8, с. 162].

Элементы вясновага навалецця на Палессі сустракаюцца ў абраднасці шэрагу свят, ад Грамніц да Ушэсця, у тым ліку прасочваюцца ў масленічных дзеях. Масленіца як адно са свят навалецця належыць да рытуалаў пераходу, асновамі якога выступаюць провады зімы і сустрэча вясны, якія ў палескай масленічнай абраднасці ўзаемазвязаны. Провады зімы на Палессі і ў памежных раёнах увасабляюцца спальваннем пудзіла, старызны, дэманстрацыяй адмыслова зробленай лялькі-пудзіла. Усходняе Палессе – адзін з кампактных арэалаў спальвання пудзіла на Масленіцу; другі арэал выдзяляецца ва ўсходняй частцы Паазер'я, адзінкавыя фіксацыі сустракаюцца на Магілёўшчыне і на памежжы з ёй. Гуканне вясны на Масленіцу з'яўляецца рэгіянальнай адметнасцю Палесся, сустракаецца таксама ў Цэнтральнай Беларусі і на Смаленшчыне. Сярод асаблівасцей масленічных гуканняў – выкананне вяснянак пры вогнішчы, у якім паляць пудзіла ці старызну, лакальна (Жыткавіцкі і Столінскі р-ны) – гуканне вясны з сырам у руках.

Такім чынам, у масленічных абрадах на Палессі спалучаюцца матывы провадаў зімы і гукання вясны, якія часта выступаюць як непадзельнае цэлае.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Агапкина, Т. А. Мифопоэтические основы славянского народного календаря: Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М. : Индрик, 2002. – 816 с.

2. Ван Геннеп, А. Обряды перехода / А. Ван Геннеп. – М. : Восточная лит., 2002. – 200 с.

3. Байбурин, А. К. Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин; НАН, Музей антропологии и этнографии им. П. Великого. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.

4. Морозов, И. А. Круг игры. Праздник и игра в жизни севернорусского крестьянина (XIX–XX вв.) / И. А. Морозов, И. С. Слепцова. – М. : Индрик, 2004. – 920 с.

5. Соколова, В. К. Весеннее-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. XIX – начало XX в. / В. К. Соколова. – М. : Наука, 1979. – 288 с.

6. Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён: дадат. да 6-томнай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" / Л. І. Языковіч [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2004. – 160 с.

7. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Чачэрскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 622 с.

8. Валодзіна, Т. В. Каляндарныя святы, звычаі і абрады / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак, І. Ю. Смірнова // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука ; Вышэйш. шк., 2001–2013. – Т. 6: Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. : Кн. 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.]. – 2012. – С. 23–157.

9. Новак, В. С. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці фальклорных традыцый Добрушчыны / В. С. Новак // Зямля чароўная дабра : Добрушскі край : гісторыя і сучаснасць / пад агул. рэд. А. А. Станкевіча. – Гомель: Полеспечать, 2008. – С. 161–259.

10. Хойнікшчыны спеўная душа: народная духоўная культура Хойнікскага краю: фальклор.-этнаграф. зб. / пад агул. рэд. В. С. Новак. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 303 с.

11. Басько, В. І. Каляндарныя святы, звычаі і абрады / В. І. Басько, Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука ; Вышэйш. шк., 2001–2013. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. : Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – 2010. – С. 21–358.

12. Кухаронак, Т. І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

13. Можейко, З. Я. Песни белорусского Полесья: в 2 вып. Вып. 1 / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1983. – 184 с.

14. Барысаўшчына – гэта таксама Малое Палессе [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://barysau.by/?p=1028. – Дата доступу: 07.09.2016.

15. Архіў рэспубліканскай грамадскай арганізацыі "Студэнцкае этнаграфічнае таварыства". Аўдыяфайл 20150701_ML_01_Budcza_01.

16. Касцючык, В. М. Самабытныя моўныя адзінкі ў дыялектным і літаратурным кантэксце / В. М. Касцючык. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2013. – 124 с.

17. Басько, В. І. Масленіца / В. І. Басько, А. М. Боганева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука ; Вышэйш. шк., 2001–2013. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне / А. М. Боганева [і інш.]. – 2004. – С. 64–76.

18. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 23. Воп. 15. Спр. 4. Арк. 3.

19. Валодзіна, Т. В. Салома / Т. В. Валодзіна // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 448–449.

20. Барвенава, Г. Асноўныя памылкі рэжысёраў сучасных святаў у выкарыстанні народнага касцюма / Г. Барвенава // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : матэрыялы VII Міжнар. навук. канф., Мінск, 26–28 красавіка 2013 г. / БДУКМ; рэдкал.: Языковіч В. Р. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 157–161.

21. Басько, В. І. Каляндарныя святы, звычаі і абрады / В. І. Басько, Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука ; Вышэйш. шк., 2001–2013. – Т. 4. Брэсцкае Палессе : у 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – 2008. – С. 19–244.

22. Прыбылова, В. М. Музычны ландшафт песенна-абрадавых традыцый Масленіцы Верхняга Падняпроўя / В. М. Прыбылова. – Мінск : Беларус. дзярж. акад. музыкі, 2010. – 151 с.

23. Басько, В. І. Каляндарныя звычаі і абрады / В. І. Басько, Т. Б. Варфаламеева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука ; Вышэйш. шк., 2001–2013. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / В. І. Басько [і інш.]. – 2001. – С. 17–184.

24. Басько, В. І. Каляндарныя святы, звычаі і абрады / В. І. Басько, Т. І. Кухаронак // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука ; Вышэйш. шк., 2001–2013. – Т. 3. : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. : Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – 2006. – С. 21–262.

25. Гульні, забавы, ігрышчы / уклад. А. Ю. Лозка. – 3-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 534 с. – (Беларуская народная творчасць).

26. Фальклор прыпяцкага запаведніка / уклад. І. В. Глушэц [і інш.]. – Гомель : Гомел. абласны цэнтр народнай творчасці, 2013. – 78 с.

27. Народныя святы Берасцейшчыны // Астрамечаўскі рукапіс. Брэсцкі раённы краязнаўчы альманах. – 2014. – № 1 – С. 31–38.

28. Фальклорны архіў Дзяржаўнай установы “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”. Сш. 7–1.

29. Фальклорны архіў Дзяржаўнай установы “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”. Сш. 22–1. Арк. 56.

30. Доўнар-Запольская, А. М. Захаванасць старажытных элементаў у масленічным комплексе (Палессе) / А. М. Доўнар-Запольская // Рэгіянальныя асаблівасці фальклору і літаратуры славянскіх народаў: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 23–24 красавіка 2004 г. / пад рэд. І. Ф. Штэйнера. – Гомель : ГДУ імя Ф.Скарыны, 2004. – С. 208–211.


## References


1.Agapkina T. A., Mifopoeticheskie osnovy slavianskogo narodnogo kalendaria: vesenne-letnii tsykl [Mythical and Poetic Basis of Slavic Folk Calendar: The Spring-summer Cycle], Indrik, Moscow, RU, 2002.

2.Van Gennep A., Obriady perekhoda [Rites of Passage], Vostochnaia literatura, Moscow, RU, 2002.

3.Baiburin A. K., Ritual v traditsionnoi culture [Ritual in Traditional Culture], Nauka, SPb, RU, 1993.

4.Morozov I. A., Sleptsova I. S., Krug igry. Prazdnik i igra v zhizni severorusskogo krest’ianina (XIX–XX vv.) [Circle of Game. Feast and Game in the life of the Russian Northern Peasant (19th – 20th Centuries)], Indrik, Moscow, RU, 2004.

5.Sokolova V. K., Vesenne-letnie kalendarnye obriady russkikh, ukraintsev i belorusov. XIX – nachalo XX vv. [Spring-summer Calendar Rites of Russians, Ukrainians and Belarusians in the 19th – early 20th centuries], Nauka, Moscow, RU, 1979.

6.Iazykovich L. I., Atlas gistoryi Belarusi ad starazhytnastsi da nashykh dzen: dadat. da 6-tomnai “Entsyklapedyii gistoryi Belarusi” [Atlas of the History of Belarus from Antiquity to the Present Time: A Supplement to the 6-volume Encyclopedia of the History of Belarus], Belaruskaia entsyklapedyia, Minsk, BY, 2004.

7.Pamiats’: gistoryka-dakumental’naia khronika Chacherskaga raena [Memory: A Historical-documental Chronicle of Chechersk District], BELTA, Minsk, BY, 2000.

8.Valodzina T. V., Kukharonak T. I., Smirnova I. I., “Calendar feasts, customs, rites”, in Varfalameeva T. B. (ed.), Tradytsyinaia mastatskaia kultura belarusaў: tom 6. Gomel’skae Palesse i Padniaproўe : u 2 knigakh : kniga 1 [Traditional Art culture of Belarus: Vol. 6: Polesie and the Dnieper Land in Gomel Region: in 2 books : Book 1], Vysheishaia shkola, Minsk, BY, 2012, pp. 23–157.

9.Novak V. S., “Regional and Local Peculiarities of Folk Traditions in Dobrush District”, in Ziamlia charoўnaia dabra: Dobrushski krai: gistoryia i suchasnasts’ [The Fairy Land of Kindness: Dobrush District: A History and Present Times], Polespechat’, Homiel, BY, 2008, pp. 161–259.

10.Novak V. S. (ed.), Khoinikshchyny speўnaia dusha: narodnaia dukhoўnaia kul’tura Choinikskaga kraiu: fal’klor.-etnagraf. zb. [The Singing Soul of Choyniki District: The People’s Spiritual Culture: A Folk and Ethnographic Collection], Vyd. tsentr BSU, Minsk, BY, 2010.

11.Bas’ko V. I., Valodzina T. V., Kukharonak T. I., “Calendar feasts, customs, rites”, in Varfalameeva T. B. (ed.), Tradytsyinaia mastatskaia kultura belarusaў: tom 5. Central’naia Belarus: u 2 knigakh: kniga 1 [Traditional Art Culture of Belarus: Vol. 5: Central Belarus: in 2 books: Book 1], Vysheishaia shkola, Minsk, BY, 2010, pp. 21 – 358.

12.Kukharonak T. I., Maski u kaliandarnai abradnastsi belarusaў [Masks in Belarusians’ Calendar Rites], Uradzhai, Minsk, BY, 2001.

13.Mozheiko, Z. Ia., Pesni belorusskogo Poles’ia: vyp. 2 [Songs of Byelorussian Polesie, Issue 2], Sov. Compozitor, Moscow, RU, 1983.

14.“The Land of Borisov is Part of Small Polesie”, available at: http://barysau.by/?p=1028, (Accessed 07 September 2016).

15.“Audio file 20150701_ML_01_Budcza_01”, in Archiў respublikanskai gramadskai arganizatsyi “Studentskae etnagrafichnae tavarystva” [Archive of the Students’ Ethnographic Association, a national NGO], Minsk, BY, 2015.

16.Kastsiuchyk V. M., Samabytnyia moŭnyia adzinki ў dyшalektnym ш litaraturnym kantekseыe [Original Linguistic Units in Dialectal and Literary Context], BrSU, Brest, BY, 2013.

17.Bas'ko V. I., Boganieva A. M., "Shrovetide", in Varfalameeva T. B. (ed.), Tradytsyinaia mastatskaia kul'tura belarusaŭ: tom 2. Vitsebskae Padzvinne [Traditional Art Culture of Belarus: Vol. 2: The Dvina Land of Vitebsk], Bel. navuka, Minsk, BY, 2004, pp. 64–76.

18."F. 23, inv. 15, c. 4, p. 3", in Arkhiŭ Instytuta mastatstvaznaŭstva, etnagrafii i fal'klory imia Kandrata Krapivy Nacyianal'nai akademii navuk Belarusi [Archive of the Institute for Arts, Ethnography and Folklore of the National Academy of Sciences of Belarus], Minsk, BY, 2015.

19.Valodzina T. V., "Straw", in San'ko S., Valodzina T., Vasilevich U., Belaruskaia mifalogiia: entsyklapedychny sloŭnik [Belarusian Mythology: An Encyclopedic Dictionary], Belarus, Minsk, BY, 2004, pp. 448–449.

20.Barvenava G., "The Most Common Mistakes in Using Folk Costumes by Directors Staging Modern Feasts", in Iazykovich L. I (ed.), Zb. navuk. prats udz. VII Mizhnar. navuk. canf. "Autentychny fal'klor: prablemy zakhavannia, vyvuchennia, usprymannia [Proc. Of the 7th Int. Conf. "Authentic Folklore: Problems of Preservation, Research, and Perception"], BSU of Culture and Arts, Minsk, BY, 2013, pp. 157–161.

21.Bas'ko V. I., Valodzina T. V., Kukharonak T. I., "Calendar feasts, customs, rites", in Varfalameeva T. B. (ed.), Tradytsyinaia mastatskaia kul'tura belarusaŭ: tom 4. Brestskae Palesse: u 2 knigakh : kniga 1 [Traditional Art Culture of Belarus: Vol. 4: Brest Polesie: in 2 books: Book 1], Vysheishaia shkola, Minsk, BY, 2008, pp. 19–244.

22.Prybylova V. M., Muzychny landshaft pesenna-abradavykh tradycyi Maslenitsy Verkhniaga Padniaproўia [Music Landscape of Singing and Ritual Traditions of Maslenitsa in the Lower Dnieper Land], Belarusian State Academy of Music, Minsk, BY, 2010.

23.Bas'ko V. I., Varfalameeva T. B., "Calendar Customs and Rites", in Varfalameeva T. B. (ed.), Tradytsyinaia mastatskaia kul'tura belarusaŭ: tom 1. Magileŭskae Padniaproŭe [Traditional Art Culture of Belarus: Vol. 1: The Dnieper Land of Mogilev], Belaruskaia navuka, Minsk, BY, 2001, pp. 17–184.

24.Bas'ko V. I., Kukharonak T. I., "Calendar Feasts, Customs, and Rites", in Varfalameeva T. B. (ed.), Tradytsyinaia mastatskaia kul'tura belarusaŭ: tom 3. Grodzenskae Paniamonne: u 2 knigakh : kniga 1 [Traditional Art Culture of Belarus: Vol. 3: The Neman Land of Grodno: in 2 books : Book 1], Vysheishaia shkola, Minsk, BY, 2006, pp. 21 – 262.

25.Lozka A. J., Gul'ni, zabavy, igryshchy [Games, Entertainment, and Merrymaking], Seryia "Belaruskaia narodnaia tvorchasts'" [The Belarusian Folk Art Series], 3nd ed., Belaruskaia navuka, Minsk, BY, 2003.

26.Hlushets I. V., Mel'nikava, L., Loi, G. P., Fal'klor prypiatskaga zapavednika [The Folklore of the Prypiats Reserve], Gomel'ski ablasny tsentr narodnai tvorchastsi, Homiel, BY, 2013.

27."Folk Feasts of Brest Region", in Astramechaŭski rukapis. Brestski raenny kraiaznaŭchy al'manakh [Manuscript from Ostromechevo. The Local history Almanac of Brest Region], Brest, BY, 2014, no. 1, pp. 31–38.

28.Sshytak 7-1 [Notebook 7-1], in Fal'klorny arkhiŭ dziarzhaŭnai ustanovy "Minski ablasny tsentr narodnai tvorchastsi" [Folklore Archive of the Minsk Regional Folk Art Center], Minsk, BY

29.Sshytak 22-1, ar. 56 [Notebook 7-1, p. 56], in Fal'klorny arkhiŭ dziarzhaŭnai ustanovy "Minski ablasny tsentr narodnai tvorchastsi" [Folklore Archive of the Minsk Regional Folk Art Center], Minsk, BY

30.Doŭnar-Zapol'skaia A. M., "Preservation of Archaic Elements in the Set of Maslenitsa Rites (Polesie)", in Shteiner I. F. (ed.), Materyialy Mizhnarodnai navukovai kanferentsyi "Rehijanalnyja asablivasci falkloru I litaratury slavianskich narodau" [Proc. Of the Int. Conf. "Regional Peculiarities of the Folklore and Literature of the Slavic Peoples"], Homiel state university, Homiel, BY, 2004, pp. 208 – 211.

## Информация об авторе

*Лешкевич Елена Игоревна* – аспирант. ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : sionniaviecier@gmail.com.

## Information about the author

*Leshkevich Elena Igorevna,* Postgraduate Student, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: sionniaviecier@gmail.com.

## Для цитирования

Ляшкевiч, А. I. Тэмы провадаў зiмы i сустрэчы вясны ў масленiчных абрадах беларускага Палесся / А. I. Ляшкевiч // Вес. Нац. акад. навук Беларусi. Сер. гуманiт. навук. – 2017. – № 2. – С. 82–90.

## For citation

Leshkevich Ye. I. Motives of Bidding Farewell to Winter and Greeting Spring in Shrovetide Rites in Belarusian Polesie Region. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 2, pp. 82–90.